# КЛАСІФІКАЦЫЯ МЕТАДАЎ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ: АДЗІНСТВА АГУЛЬНАГА І АСАБЛІВАГА

М. Л. Кузьмініч, Мінск, Беларусь

У сучаснай педагогіцы музычнай адукацыі апісаны разнастайныя метады музычна-педагагічнага працэсу. У той жа час у сваёй практычнай дзейнасці педагог-музыкант (гэта асабліва праяўляецца падчас здачы кваліфікацыйных экзаменаў, удзелу ў конкурсах прафесійнага майстэрства ці эксперыментальных і інавацыйных праектаў) часта паступае стыхійна, інтуітыўна, у яго адсутнічае цэласнае ўяўленне пра сукупнасць і ўзаемасувязь метадаў і прыёмаў, абумоўленасць іх выбару мэтай, задачамі і зместам прафесійнай дзейнасці. Вырашэнню гэтай праблемы, на наш погляд, дапаможа класіфікацыя метадаў музычнай адукацыі з улікам тых класіфікацый, што прыняты ў агульнай педагогіцы.

Метады педагагічнага працэсу – гэта спосабы ўзаемазвязанай дзейнасці выкладчыка і вучняў, накіраваныя на дасягненне мэты, рашэнне пастаўленых задач і засваенне зместу навучання, выхавання і развіцця вучняў.

Існуючыя класіфікацыі метадаў у агульнай педагогіцы дынамічныя і адлюстроўваюць разнастайнасць і рухомасць педагагічнага працэсу. Сярод такіх класіфікацый – вылучэнне метадаў па крыніцы ведаў; па прызначэнні (па дыдактычных задачах); па характару пазнавальнай дзейнасці. Дзейнасць выкладчыка і вучня – гэта два складнікі метаду. Адпаведна прапаноўваецца класіфікацыя метадаў, пабудаваная на спалучэнні метадаў выкладання і метадаў вучэння (М. І. Махмутаў). Цэласная педагагічная дзейнасць выступае ў адзінстве працэсаў выхавання, навучання і развіцця. Таму вылучаюць метады развіцця, метады навучання, метады выхавання. Комплексны дзейнасна-працэсуальны падыход да педагагічнай дзейнасці дазваляе вылучыць метады стымулявання і матывацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, метады арганізацыі і здзяйснення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, метады кантролю і самакантролю эфектыўнасці вучэбна-пазнавальнай дзейнасці (Ю. К. Бабанскі).

У музычнай адукацыі выкарыстоўваюцца як агульнапедагагічныя метады, так і метады спецыфічныя, якія вызначаюцца спецыфікай музычнага мастацтва. Спецыфічныя метады – гэта спосабы сумеснай дзейнасці педагога і навучэнцаў у адпаведнасці з прыродай музыкі і музычнай прыродай саміх навучэнцаў. Яны накіраваны на фарміраванне музычнай культуры асобы – развіццё яе музычных здольнасцей, фарміраванне сістэмы музычных ведаў, уменняў і навыкаў, выхаванне музычных патрэбнасцей, інтарэсаў, эстэтычных перакананняў, ідэалаў і густаў. Вучні з дапамогай метадаў і ў адпаведнасці з пастаўленымі задачамі прысвойваюць духоўныя каштоўнасці музычнай культуры, авалодваюць асновамі музычна-выканальніцкага майстэрства, фарміруюць свой светапогляд і развіваюць здольнасці для далейшага самастойнага набыцця і творчага выкарыстання ведаў, уменняў і навыкаў у сферы музычнай творчасці.

Метад у музычна-педагагічным працэсе можа характарызаваць: 1) пэўны аспект фарміравання музычнай культуры асобы (яе музычную выхаванасць, навучанасць ці развітасць); 2) спосаб спасціжэння зместу музычнага твора; 3) адзін з відаў музычнай дзейнасці (сачыненне, слуханне, выкананне) ці форму музычнай дзейнасці – спевы, засваенне музычнай граматы, імправізацыя, слуханне музыкі, ігра на музычных інструментах і г. д. Таму мы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прапануем класіфікацыю спецыфічных метадаў музычна-педагагічнага працэсу, якая дапаўняе прыведзеныя вышэй класіфікацыі агульнапедагагічных метадаў.

У аснову прапануемай класіфікацыі пакладзены наступныя метадалагічныя ўстаноўкі. Выбар метадаў у музычна-педагагічным працэсе залежыць, у прыватнасці, ад яго мэты, задач і зместу. Мэта музычна-педагагічнага працэсу – фарміраванне музычнай культуры асобы – можа разглядацца як прысвоеная суб’ектам адукацыі музычная культура грамадства. У сваю чаргу, музычная культура грамадства – гэта мастацкія каштоўнасці, створаныя ў соцыўме, усе віды дзейнасці па іх стварэнні, зберажэнні, распаўсюджанні і г. д., а таксама суб’екты названых відаў дзейнасці. З гэтага пункту гледжання ўвага педагога скіравана на вучня – суб’екта музычнай культуры грамадства, на музычныя каштоўнасці і, нарэшце, на пэўныя бакі і віды музычнай дзейнасці.

У дачыненні да фарміруемай асобы вучня можна весці гаворку пра неабходнасць вылучэння метадаў фарміравання музычнай адукаванасці – музычнай навучанасці, выхаванасці і развітасці.

Фарміраванне музычнай культуры асобы з’яўляецца галоўным у дзейнасці педагога, але не выключае іншых аб’ектаў яго ўвагі – музычных каштоўнасцей, бакоў і відаў музычнай дзейнасці. Таму можна вылучыць групу метадаў спасціжэння навучэнцамі зместу музычных твораў, сярод якіх называюць метад назірання за музыкай, метад пераканання і захаплення музыкай, разважання аб музыцы і інш.

Па-за ўвагай педагога не могуць застацца разнастайныя формы і віды музычнай дзейнасці, а таму мэтазгодна вылучэнне групы метадаў спасціжэння навучэнцамі розных відаў музычнай камунікацыі і адпаведных ім форм (відаў) музычнай дзейнасці: метады сачынення музыкі, імправізацыі, пераінтаніравання, пластычнага інтаніравання і інш.

Метады – гэта спосабы арганізацыі сумеснай дзейнасці педагога і навучэнцаў, таму дарэчы будзе сумясціць прадстаўленыя групы метадаў з вядомай у агульнай педагогіцы класіфікацыяй на аснове дзейнасна-працэсуальнага падыходу, калі ўсе метады дзеляцца на тры вялікія групы: метады матывацыі і стымуляцыі вучэбнай дзейнасці, метады арганізацыі і здзяйснення вучэбнай дзейнасці і метады кантролю і самакантролю. Дадзеная класіфікацыя з’яўляецца ўніверсальнай, бо пабудавана на трохэтапнай структуры любой дзейнасці. Яна сумяшчальная з прыведзенымі вышэй класіфікацыямі. Такім чынам, прапануемая намі класіфікацыя груп метадаў можа выглядаць наступным чынам [1, с. 175]:

Табліца – Класіфікацыя метадаў музычнай адукацыі

| Групы метадаў у адпаведнасці са структурай педагагічнай дзейнасці | Групы метадаў у адпаведнасці са структурай музычнай культуры грамадства (музычныя каштоўнасці – віды музычнай дзейнасці – навучэнцы як суб’ект адукацыйнага працэсу) | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Навучэнцы як суб’ект музычнай культуры грамадства | | | Музычныя творы як мастацкія каштоўнасці грамадства | | Віды музычнай камунікацыі і адпаведныя віды музычнай дзейнасці | | |
| | Метады музыч- | Метады музыч- | Метады му- | Метады засваен- | Метады засваення | Метады засваення | Метады засваення | Метады засваення |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | нага навучання | нага выхавання | зычнага развіцця | ня зместу музыкі | мовы музыкі | кампазітарскай дзейнасці | слухацкай дзейнасці | выканальніцкай дзейнасці |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Матывацыі і стымуляцыі вучэбнай дзейнасці | | | | | | | | |
| Арганізацыі і здзяйснення вучэбнай дзейнасці | | | | | | | | |
| Кантролю і самакантролю вучэбнай дзейнасці | | | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Зразумела, прапануемая класіфікацыя не ахоплівае ўсёй сукупнасці разнастайных метадаў музычна-педагагічнай дзейнасці. Так, спецыфіка музычна-педагагічнага працэсу адлюстравалася таксама ў імкненні выкарыстоўваць спецыфічныя метады арганізацыі ўрока музыкі і вучэбнай музычна-творчай дзейнасці. Гэтыя метады ўтвараюць яшчэ адну групу. Сярод іх: метад эмацыянальнай драматургіі, міждысцыплінарных узаемадзеянняў, мадэлявання мастацка-творчага працэсу і інш.

Акрамя разгледжаных вышэй метадаў навучання музычна-педагагічная практыка назапасіла комплексныя метады, якія ў пэўных умовах набываюць характар метадычных прынцыпаў навучання. Сярод іх метады, агульныя для педагогікі мастацтва – пабуджэння да суперажывання, далучэння да мастацкай творчасці і сатворчага ўспрымання мастацтва, стварэння абстаноўкі ўнутранага эмацыянальнага прыняцця мастацкага твора і іншыя.

Такім чынам, у метадычным арсенале выкладчыка музыкі маецца вялікая колькасць спосабаў вырашэння педагагічных задач з улікам спецыфікі музычнага мастацтва. Але эфектыўнасць іх выкарыстання вызначаецца найбольш мэтазгодным спалучэннем метадаў у розных тыповых умовах навучальнага працэсу.

- Літаратура

Кузьмініч, М. Л. Тэарэтычныя асновы музычнай адукацыі : вучэб.-метад. дапам. / М.Л. Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2013. – 364 с.